ПАСТАНОВА САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
10 чэрвеня 2006 г. № 730

# Аб зацвярджэнні Палажэння аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь

Изменения и дополнения:

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 14 августа 2007 г. № 1033 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2007 г., № 199, 5/25652) <C20701033>;

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 23 декабря 2008 г. № 2010 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2009 г., № 14, 5/29066) <C20802010>;

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 22 декабря 2009 г. № 1691 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2010 г., № 1, 5/30957) <C20901691>;

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 7 октября 2011 г. № 1339 (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2011 г., № 116, 5/34573) <C21101339>

У адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 21 Закона Рэспублікі Беларусь ад 12 снежня 2005 года «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» і ў мэтах забеспячэння эфектыўнага захоўвання, уліку і выкарыстання музейных прадметаў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацвердзіць прыкладзенае Палажэнне аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь.

2. Рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, дзяржаўным арганізацыям забяспечыць да 31 снежня 2012 г. прадстаўленне ў Міністэрства культуры звестак аб музейных прадметах, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці або не нададзены такі статус, але якія з’яўляюцца рэдкімі ў сваім родзе прадметамі і існуюць у адзіным экзэмпляры або ў абмежаванай колькасці (далей – асабліва каштоўныя музейныя прадметы), дзяржаўных музеяў, якія знаходзяцца ў іх музейных фондах на дзень уступлення ў сілу Закона Рэспублікі Беларусь ад 12 снежня 2005 года «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2005 г., № 197, 2/1167), у парадку згодна з зацверджаным Палажэннем аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь.

3. Міністэрству культуры забяспечыць уключэнне да 31 снежня 2013 г. у Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь атрыманых звестак аб асабліва каштоўных музейных прадметах дзяржаўных музеяў, якія знаходзяцца ў іх музейных фондах на дзень уступлення ў сілу Закона Рэспублікі Беларусь «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь».

4. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу з 23 чэрвеня 2006 г.

**Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь** **С.Сідорскі**

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Савета Міністраў
Рэспублікі Беларусь
10.06.2006 № 730
(у рэдакцыі пастановы
Савета Міністраў

Рэспублiкi Беларусь
07.10.2011 № 1339)

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб Музейным фондзе Рэспублiкi Беларусь**

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННI

1. Дадзеным Палажэннем вызначаецца парадак:

уключэння музейных прадметаў у Музейны фонд Рэспублiкi Беларусь (далей – Музейны фонд) i iх выключэння з Музейнага фонду;

захоўвання, выкарыстання музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд, i распараджэння iмi;

цэнтралiзаванага ўлiку музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд, якiм нададзены статус гiсторыка-культурнай каштоўнасцi або не нададзены такi статус, але якiя з’яўляюцца рэдкiмi ў сваiм родзе прадметамi i iснуюць у адзiным экзэмпляры або ў абмежаванай колькасцi (далей – асаблiва каштоўныя музейныя прадметы);

фармiравання i вядзення Дзяржаўнага каталога Музейнага фонду Рэспублiкi Беларусь (далей – Дзяржаўны каталог).

## ГЛАВА 2
## СКЛАД МУЗЕЙНАГА ФОНДУ

2. Музейны фонд уключае музейныя прадметы ўсiх дзяржаўных музеяў.

У Музейны фонд могуць быць уключаны асобныя музейныя прадметы прыватных музеяў у парадку, устаноўленым у пункце 6 дадзенага Палажэння.

3. Музейныя прадметы дзяржаўных музеяў з’яўляюцца дзяржаўнай уласнасцю i не падлягаюць звароту iх ранейшым уласнiкам, акрамя выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам.

4. Музейныя прадметы, уключаныя ў Музейны фонд, з’яўляюцца неад’емнай часткай культурнай спадчыны Рэспублiкi Беларусь.

## ГЛАВА 3
## ПАРАДАК УКЛЮЧЭННЯ МУЗЕЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ У МУЗЕЙНЫ ФОНД I IХ ВЫКЛЮЧЭННЯ З МУЗЕЙНАГА ФОНДУ

5. Музейныя прадметы дзяржаўных музеяў лiчацца ўключанымi ў Музейны фонд пасля iх рэгiстрацыi ў кнiзе паступленняў музейных прадметаў асноўнага фонду (галоўнай iнвентарнай кнiзе) гэтых музеяў.

6. Для прыняцця рашэння аб уключэннi ў Музейны фонд музейнага прадмета (музейных прадметаў) прыватных музеяў у Мiнiстэрства культуры прадстаўляюцца:

пiсьмова афармленая заява прыватнага музея аб уключэннi музейнага прадмета (музейных прадметаў) у Музейны фонд па форме згодна з дадаткам 1 або пiсьмова афармленая згода ўласнiка музейнага прадмета (музейных прадметаў);

копiя статута (палажэння) прыватнага музея;

iнфармацыя аб музейным прадмеце, якi прапаноўваецца для ўключэння ў Музейны фонд, па форме згодна з дадаткам 2.

Рашэнне аб уключэннi ў Музейны фонд музейных прадметаў прыватных музеяў прымаецца Мiнiстэрствам культуры ў форме загада.

7. Для прыняцця рашэння аб выключэннi музейнага прадмета (музейных прадметаў) з Музейнага фонду дзяржаўны музей або юрыдычная асоба, структурным падраздзяленнем якой з’яўляецца музей, прадстаўляе ў Мiнiстэрства культуры:

заяву, у якой пазначаны прычыны выключэння музейнага прадмета (музейных прадметаў);

выпіску з рашэння ўпаўнаважанай камісіі, склад якой зацвярджаецца кіраўніком дзяржаўнага музея або юрыдычнай асобы, структурным падраздзяленнем якой з'яўляецца музей;

вопіс музейных прадметаў, што падлягаюць выключэнню.

Музейныя прадметы, якія пастаянна захоўваюцца ў прыватных музеях, выключаюцца з Музейнага фонду на падставе пісьмова афармленай заявы прыватнага музея аб выключэнні музейнага прадмета (музейных прадметаў) з Музейнага фонду па форме згодна з дадаткам 3.

Рашэнне аб выключэнні музейных прадметаў з Музейнага фонду прымаецца Міністэрствам культуры ў форме загада.

## ГЛАВА 4
## АСАБЛІВАСЦІ ВЫКАРЫСТАННЯ МУЗЕЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ, УКЛЮЧАНЫХ У МУЗЕЙНЫ ФОНД, І РАСПАРАДЖЭННЯ ІМІ

8. Музейныя прадметы, уключаныя ў Музейны фонд, у працэсе музейнай дзейнасці выкарыстоўваюцца ў мэтах забеспячэння агульнадаступнасці культурных каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры, выкарыстання іх для інтэлектуальнага і культурнага развіцця грамадства, у тым ліку для распаўсюджвання ведаў аб навакольным асяроддзі, гісторыі і культуры.

9. Забараняецца выкарыстанне музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд, ва ўмовах, якія ствараюць пагрозу іх захаванню і (або) могуць прывесці да іх пашкоджання, страты або знішчэння. У мэтах забеспячэння захавання музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд, і выключэння выпадкаў іх пашкоджання, страты або знішчэння ў музеях устанаўліваецца навукова абгрунтаваны спецыяльны рэжым захоўвання музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд, праводзяцца іх кансервацыя і рэстаўрацыя.

Правядзенне кансервацыйных і рэстаўрацыйных работ ажыццяўляецца спецыялістамі адпаведнай кваліфікацыі.

10. Музейныя прадметы, уключаныя ў Музейны фонд, вывазу за межы Рэспублікі Беларусь на пастаяннае захоўванне не падлягаюць, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

11. Часовы вываз музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд, за межы Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

12. Перадача музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд, на часовае захоўванне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ад аднаго музея да другога і ад музея да іншай арганізацыі тэрмінам да аднаго года ажыццяўляецца на падставе пісьмовай дамоўленасці паміж імі пры наяўнасці пісьмовага дазволу заснавальніка музея.

Перадача музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд, якія з'яўляюцца гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі «0», «1» або «2» катэгорыі, а таксама тых, што стаяць на спецыяльным уліку, на часовае захоўванне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ад аднаго музея да другога і ад музея да іншай арганізацыі тэрмінам да аднаго года ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным у частцы першай дадзенага пункта, з пісьмовага дазволу Міністэрства культуры.

13. Перадача музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд, на пастаяннае захоўванне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ад аднаго музея да другога ажыццяўляецца на падставе пісьмовай дамоўленасці паміж імі або юрыдычнымі асобамі, структурнымі падраздзяленнямі якіх з'яўляюцца музеі, пры наяўнасці пісьмовага дазволу заснавальніка музея і дазволу Міністэрства культуры, які афармляецца загадам.

14. Пры ліквідацыі дзяржаўнага музея музейныя прадметы, уключаныя ў Музейны фонд, перадаюцца па рашэнню заснавальніка музея і па ўзгадненню з Міністэрствам культуры іншым дзяржаўным музеям.

15. Наведвальнікі музеяў могуць працаваць з музейнымі прадметамі, уключанымі ў Музейны фонд, у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

16. Права першай публікацыі аб музейных прадметах, уключаных у Музейны фонд, належыць музею, у музейны фонд якога яны ўключаны.

Выраб выяўленчай, друкаванай, сувенірнай і іншай тыражаванай прадукцыі і вытворчасць тавараў народнага спажывання з выкарыстаннем выяў музейных прадметаў, будынкаў музеяў, аб’ектаў, размешчаных на тэрыторыях музеяў, у тым ліку з выкарыстаннем іх назваў і сімволікі, ажыццяўляюцца толькі з дазволу музеяў.

17. Асобы, якія парушылі правілы выкарыстання, захоўвання і ўліку музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд, нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам.

## ГЛАВА 5
## УЛІК МУЗЕЯМІ МУЗЕЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ, УКЛЮЧАНЫХ У МУЗЕЙНЫ ФОНД. ЦЭНТРАЛІЗАВАНЫ ЎЛІК АСАБЛІВА КАШТОЎНЫХ МУЗЕЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ. ДЗЯРЖАЎНЫ КАТАЛОГ

18. Парадак вядзення музеямі ўліку музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд, устанаўліваецца Міністэрствам культуры.

19. Музейныя прадметы, уключаныя ў Музейны фонд, бухгалтарскаму ўліку не падлягаюць.

20. Асабліва каштоўныя музейныя прадметы падлягаюць цэнтралізаванаму ўліку.

Рашэнне аб аднясенні музейных прадметаў да асабліва каштоўных музейных прадметаў, за выключэннем тых, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, прымаецца музеем. Дадзенае рашэнне падлягае ўзгадненню з экспертным саветам па пытаннях аднясення музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд, да асабліва каштоўных музейных прадметаў, які ствараецца пры Міністэрстве культуры або ўпаўнаважанай ім арганізацыі. Склад і палажэнне аб дадзеным экспертным савеце зацвярджаюцца Міністэрствам культуры.

21. Цэнтралізаваны ўлік асабліва каштоўных музейных прадметаў ажыццяўляецца Міністэрствам культуры або ўпаўнаважанай ім арганізацыяй шляхам уключэння ў Дзяржаўны каталог прадстаўленых звестак аб гэтых музейных прадметах.

22. Вядзенне Дзяржаўнага каталога ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

23. Дзяржаўны каталог уяўляе сабой сукупнасць асноўных звестак аб кожным асабліва каштоўным музейным прадмеце, уключаным у Музейны фонд.

24. Асноўнымі мэтамі вядзення Дзяржаўнага каталога з’яўляюцца:

цэнтралізаваны ўлік усіх асабліва каштоўных музейных прадметаў;

ідэнтыфікацыя і папулярызацыя асабліва каштоўных музейных прадметаў.

25. У мэтах вядзення Дзяржаўнага каталога Міністэрства культуры або ўпаўнаважаная ім арганізацыя ажыццяўляе:

збор звестак аб асабліва каштоўных музейных прадметах па форме згодна з дадаткам 4;

улік наяўнасці і кантроль захаванасці асабліва каштоўных музейных прадметаў.

26. Вядзенне Дзяржаўнага каталога ажыццяўляецца на беларускай і рускай мовах, а для асабліва каштоўных музейных прадметаў, інфармацыя аб якіх распаўсюджваецца ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт, – дадаткова на англійскай мове.

27. Звесткі аб асабліва каштоўных музейных прадметах уносяцца ў Дзяржаўны каталог у двухмесячны тэрмін з дня іх паступлення.

28. Уладальнікі асабліва каштоўных музейных прадметаў павінны ў месячны тэрмін паведамляць у Міністэрства культуры або ўпаўнаважаную ім арганізацыю аб любых зменах звестак, прадстаўленых імі ў Дзяржаўны каталог.

У выпадку змены ўласніка асабліва каштоўнага музейнага прадмета прыватнага музея ранейшы ўласнік павінен у дзесяцідзённы тэрмін паведаміць аб гэтым у Міністэрства культуры або ўпаўнаважаную ім арганізацыю.

29. Звесткі аб стратах або знішчэннях асабліва каштоўных музейных прадметаў накіроўваюцца ў Міністэрства культуры ў трохдзённы тэрмін з моманту ўстанаўлення факта іх страты або знішчэння.

30. Звесткі, якія змяшчаюцца ў Дзяржаўным каталогу, носяць адкрыты характар, за выключэннем звестак, што падлягаюць абмежаванаму распаўсюджванню ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Звесткі аб асабліва каштоўных музейных прадметах распаўсюджваюцца ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт.

31. Для забеспячэння захаванасці звестак, уключаных у Дзяржаўны каталог, ажыццяўляецца іх абавязковае страхавое капіраванне.

Дадатак 1
да Палажэння
аб Музейным фондзе
Рэспублікі Беларусь

Форма

**ЗАЯВА**
**аб уключэнні музейнага прадмета (музейных прадметаў)**
**у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь**

Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь

Просім уключыць у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь музейны прадмет (музейныя прадметы) у колькасці ______________________________________________.
(указваецца колькасць адзінак лічбай і прописсю)

Пацвярджаем, што ____________________________________________________
(указваецца назва прыватнага музея)
_____________________________________________________________________
_____________________________________________________________________
з'яўляецца адзіным уласнікам дадзенага музейнага прадмета (музейных прадметаў).

Абавязуемся ў адносінах да музейнага прадмета (музейных прадметаў) забяспечыць выкананне ўсіх патрабаванняў заканадаўства аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь.

Звесткі аб прыватным музеі: ___________________________________________
(месцазнаходжанне прыватнага музея згодна з яго ўстаноўчымі
_____________________________________________________________________
дакументамі, тэлефон, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (пры наяўнасці)
_____________________________________________________________________
кіраўніка прыватнага музея)
_____________________________________________________________________.

Дадатак: 1. Вопіс музейных прадметаў, якія прапаноўваюцца для ўключэння ў Музейны фонд Рэспублікі Беларусь на ___ л. у ___ экз.
2. Інфармацыя аб музейным прадмеце (музейных прадметах), які прапаноўваецца для ўключэння ў Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, на ___ л. у ___ экз.

____________________ (подпіс)

____________________ (прозвішча, ініцыялы кіраўніка прыватнага музея)

Дата складання заявы ___ ________________ 20__ г.

Дадатак 2
да Палажэння
аб Музейным фондзе
Рэспублікі Беларусь

Форма

**ІНФАРМАЦЫЯ**
**аб музейным прадмеце, які прапаноўваецца для ўключэння**
**ў Музейны фонд Рэспублікі Беларусь***

1. Назва прыватнага музея.

2. Ідэнтыфікацыйны нумар музейнага прадмета, шыфр і катэгорыя па Дзяржаўнаму спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (для гісторыка-культурных каштоўнасцей).

3. Тып музейнага прадмета.

4. Від музейнага прадмета.

5. Разнавіднасць музейнага прадмета.

6. Прадметнае імя музейнага прадмета.

7. Прыналежнасць да групы (комплексу) музейных прадметаў.

8. Мясцовая (лакальная) назва музейнага прадмета (калі існуе).

9. Аўтарская назва музейнага прадмета (калі існуе).

10. Пераклад аўтарскай назвы музейнага прадмета з замежнай мовы (калі існуе).

11. Аўтар (вытворца) музейнага прадмета (калі існуе).

12. Месца стварэння (вытворчасці) музейнага прадмета (калі існуе).

13. Час стварэння (вытворчасці) музейнага прадмета (калі вядомы).

14. Матэрыял, з якога выкананы музейны прадмет.

15. Тэхніка, тэхналогія выканання музейнага прадмета.

16. Памеры, вага музейнага прадмета.

17. Кароткае апісанне музейнага прадмета (анатацыя).

18. Знакі, надпісы, пячаткі, клеймы на музейным прадмеце (калі ёсць, іх тып, апісанне).

19. Стан захаванасці музейнага прадмета.

20. Фотаздымак музейнага прадмета ў лічбавым фармаце jpg.

______________________

*Прадстаўляецца на папяровым і электронным носьбітах.

Дадатак 3
да Палажэння
аб Музейным фондзе
Рэспублікі Беларусь

Форма

**ЗАЯВА**
**аб выключэнні музейнага прадмета (музейных прадметаў)**
**з Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь**

Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь

Просім выключыць з Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь музейны прадмет (музейныя прадметы) у колькасці ________________________________________
(указваецца колькасць адзінак лічбай і прапіссю)
згодна з вопісам па прычыне таго, што ён (яны) ______________________________
________________________________________________________________________
________________________________________________________________________
________________________________________________________________________
_
________________________________________________________________________
_
________________________________________________________________________.

Звесткі аб прыватным музеі: ____________________________________________
(назва прыватнага музея, месцазнаходжанне прыватнага музея
________________________________________________________________________
_
згодна з яго ўстаноўчымі дакументамі, тэлефон, прозвішча,

_______________________________________________________________________________
_
уласнае імя, імя па бацьку (пры наяўнасці) кіраўніка прыватнага музея)
_______________________________________________________________________________.

Дадатак: вопіс на _______ л. у ____ экз.

__________________ ___________________________
(подпіс) (прозвішча, ініцыялы кіраўніка прыватнага музея)

Дата складання заявы ___ ________________ 20__ г.

Дадатак 4
да Палажэння
аб Музейным фондзе
Рэспублікі Беларусь

Форма

**ЗВЕСТКІ**
**аб асабліва каштоўным музейным прадмеце***

1. Назва музея.
2. Ідэнтыфікацыйны нумар асабліва каштоўнага музейнага прадмета, шыфр і катэгорыя па Дзяржаўнаму спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (для гісторыка-культурных каштоўнасцей).
3. Тып асабліва каштоўнага музейнага прадмета.
4. Від асабліва каштоўнага музейнага прадмета.
5. Разнавіднасць асабліва каштоўнага музейнага прадмета.
6. Прадметнае імя асабліва каштоўнага музейнага прадмета.
7. Прыналежнасць асабліва каштоўнага музейнага прадмета да групы (комплексу) музейных прадметаў.
8. Мясцовая (лакальная) назва асабліва каштоўнага музейнага прадмета (калі існуе).
9. Аўтарская назва асабліва каштоўнага музейнага прадмета (калі існуе).
10. Пераклад аўтарскай назвы асабліва каштоўнага музейнага прадмета з замежнай мовы (калі існуе).
11. Аўтар (вытворца) асабліва каштоўнага музейнага прадмета (калі існуе).
12. Месца стварэння (вытворчасці) асабліва каштоўнага музейнага прадмета (калі існуе).
13. Час стварэння (вытворчасці) асабліва каштоўнага музейнага прадмета (калі вядомы).
14. Матэрыял, з якога выкананы асабліва каштоўны музейны прадмет.
15. Тэхніка, тэхналогія выканання асабліва каштоўнага музейнага прадмета.
16. Памеры, вага асабліва каштоўнага музейнага прадмета.
17. Кароткае апісанне асабліва каштоўнага музейнага прадмета (анатацыя).
18. Знакі, надпісы, пячаткі, клеймы на асабліва каштоўным музейным прадмеце (калі ёсць, іх тып, апісанне).
19. Стан захаванасці асабліва каштоўнага музейнага прадмета.
20. Фотаздымак асабліва каштоўнага музейнага прадмета ў лічбавым фармаце jpg.

______________________
*Прадстаўляюцца на папяровым і электронным носьбітах.